


# Газета Слонімская

Газета заснавана ў 1938 годзе. Аднаўлена ў 1997 годзе.

№18 (256) 2 — 8 ТРАЎНЯ 2002Г. НАКЛАД 12.000 ЭКЗ. КОШТ 250 РУБ.







## ПРАЙШЛА ВЕРБНІЦА. ХУТКА ВЯЛІКДЗЕНЬ

Фота Віталя ГІЛЯ



# ГАЗЕТУ РОБІМ НЕ ДЛЯ НАЧАЛЬСТВА

У нас — юбілей. Роўна пяць гадоў таму, таксама напярэдадні Вялікадня, выйшаў першы нумар "Газеты Слонімскай". Таму з гэтай нагоды мы яшчэ раз надрукавалі факсімільны першы нумар "ГС", каб чытач змог увідавоку ўявіць наш першы зроблены крок. Вядома, ён прыкметна адрозніваецца ад таго, что робім мы цяпер. І гэта зразумела, бо з самага пачатку была мэта — выпускаць добрае, прыстойнае выданне, якое магло б канкурыраваць на газетным рынку рэгіёна. Безумоўна, не ўсё адразу ўдавалася, ды і мясцовыя ўлады не вельмі спрыялі станаўленню незалежнага выдання. Тым не менш, паступова рос тыраж газеты, паляпшаўся яе дызайн і "таўсцеў" аб'ём. Вядома, у нашых пэўных дасягненнях дапамаглі нам Вы, паважаныя чытачы. Набываючы газету, Вы такім чынам рабілі свой выбар, аддаючы перавагу таму, што Вам падабаецца. Па вялікаму рахунку, газета – гэта той жа самы тавар, што і абутак, адзенне і іншая неабходная рэч. Толькі газета мае спецыфічную асаблівасць — прадастаўляе чалавеку інфармацыю пра тое, што адбываецца на месцы, у краіне і свеце. Трэба прызнаць, што і ў нас былі хібы, калі ў матэрыялах з'уляліся недакладнасці альбо проста тэхнічныя памылкі. Аднак мы заўсёды імкнуліся выправіць становішча, прынесці чалавеку сваё прабачэнне. Бо кошт слова нам вядомы. Часам яно б'е па чалавеку вельмі балюча. Але мы ніколі не ставілі мэту пакрыўдзіць кагосьці альбо абразіць. Наша задача — пісаць тое, што ёсць на самай справе, што адбываецца, а чытач хай сам робіць высновы. Па такому прынцыпу працуе амаль уся сусветная прэса. Зразумела, не ўсім падабаецца тое, што друкуецца ў газеце, і тады на "ГС" навешваюцца розныя ярлыкі, кшталту "жоўтая" ці "бэ-нэ-эфаўская". Але гэта ўжо хай застаецца на разуменні тых людзей. Як сказаў вялікі Карнегі: "Здохлую кошку нагою не пхнуць". Значыць, мы жывем. І надалей будзем рабіць такую газету, якая падабаецца чытачу, а не начальству.

**Віктар ВАЛАДАШЧУК**

СТРАТА

## ЗАГІНУЎ РЭЖЫСЁР МІХАІЛ ПТАШУК

**Як паведамілі расійскія інфармацыйныя агенцтвы, 26 красавіка ў Маскве ў аўтакатастрофе загінуў вядомы беларускі кінарэжысёр Міхаіл Пташук.**

Роўна год назад Міхаіл Пташук прывозіў у Слонім свой мастацкі фільм "У жніўні 44-га...". Яго прэм'ера адбылася ў кінатэатры "Мір". Перад прэм'ерай тады выступаў сам рэжысёр, які шчыра падзякаваў слонімцам за дапамогу ў здымках гэтага фільма. Міхаіл Пташук расказаў пра тое, як ён працаваў над фільмам у Слоніме, адказаў на пытанні гледачоў.

Дарэчы, у расійскую сталіцу беларускі рэжысёр прыязджаў для ўдзелу ў пятнаццатай цырымоніі ўручэння нацыянальнай прэміі Расіі "Ніка", дзе сярод намінантаў на ганаровы трафей быў і яго фільм "У жніўні 44-га...".

**Сяргей ЧЫГРЫН**

ПРОБЛЕМА

## ЕЩЕ ОДНА ПОПЫТКА ВЫХОДА ИЗ КРИЗИСА

**На прошлой неделе в "Газету Слонімскую" позвонила женщина, которая, не представившись, рассказала, что 25 апреля на Слонимской камвольно-прядильной фабрике начальство провело собрание с рабочими.**

По словам женщины, людей поставили перед фактом, что, мол, фабрика находится в "долговой яме", и для того, чтобы вывести предприятие из кризиса, из зарплаты каждого рабочего будут высчитывать от 5 до 7% в фонд фабрики. "А если кто-то не согласится, начальство предложило написать заявление об уходе", — рассказывала позвонившая.

Корреспондент попросила директора фабрики Павла Корнейкова прокомментировать эту ситуацию. Павел Иванович сказал, что это все неправда, ничего подобного на фабрике не было.

Лидер Свободного профсоюза Белорусского работников камвольно-прядильной фабрики Виталий Ешану рассказал, что еще в 1996-97 годах было постановление правительства начислять дополнительные 5 – 7% к заработной плате на предприятиях с высокой производительностью там, где люди работают с большой отдачей. В то время, по словам Виталия Григорьевича, и была поднята зарплата. "А сегодня, когда на фабрике отсутствует производительность, много долгов, начальство решило снять начисленные когда-то дополнительные проценты", — сказал Виталий Ешану.

**Ольга ШИНКЕВИЧ**

Курсы обмена валют в г. Слониме по состоянию на 9 45 29 апреля 2002г.

| | Покупка | Продажа |
|---|---|---|
| **"Беларусбанк"** | | |
| 1 USD | 1750 | 1780 |
| 1 EURO | 1535 | 1565 |
| 1 RUR | 55 | 57 |
| **оао "Белпромстройбанк"** | | |
| 1 USD | 1750 | 1780 |
| 1 EURO | 1535 | 1585 |
| 1 RUR | 55 | 57 |
| **"Белагропромбанк"** | | |
| 1 USD | 1755 | 1775 |
| 1 EURO | 1510 | 1532 |
| 1 RUR | 55 | 57 |
| **Нацбанк РБ** | | |
| 1 EURO | 1557,57 | |

СЕЛЬСКАЯ ЖИЗНЬ

# БЫЧОК НА ВЕРЕВОЧКЕ



Фота IREX / ProMedia

**Нет, не сказочку я вам хочу рассказать, а совершенно реальную историю, которая, действительно, связана с бычками.**

Все началось со звонка в редакцию "ГС" из колхоза "Красных партизан". Оказывается, как сообщила женщина-колхозница, председатель этого хозяйства заставил всех работников подписать бумагу с обязательством сдавать телят только в свой или в соседние колхозы, но ни в коем случае частникам. В противном случае — не даст сена для коров личного подворья.

Что ж это получается, — шантаж, произвол, самоуправство... Информацию надо было проверить, и за официальным разъяснением корреспондент "ГС" обратился к председателю колхоза Петру Борисику. Разговор состоялся примерно следующий:

*— А что вы хотите? Давать резать? Нет. Пусть сдают телят в любой колхоз, но только не под нож.*

*— А если людям жить не на что, а зарплату они не получают?*

*— Зарплату платим каждый месяц, хоть и с задержками...*

*— Но это же не выход из положения, запрещать людям сдавать скот тем закупщикам, кто предлагает лучшую цену.*

*— Звоните Костюку, Гузеню. Им это скажите. Или президенту...*

*— Так это их распоряжение?*

*— Ну, конечно!*

Прежде, чем обратиться к председателю райисполкома, позвонил в бухгалтерию колхоза "Красных партизан" и узнал, что последний раз зарплату там выплачивали 30 марта. Следующую обещали выдать к 1 мая, если с колхозом рассчитаются за поставленную продукцию.

Теперь можно было побеседовать и с Мечиславом Костюком, да только разговор с главой района получился обрубленным. Вновь привожу диалог, опустив вступительную часть:

*— Так что, по-вашему, пусть целуют руки частникам? А ведь, чуть что — в колхоз за помощью бегут, — сказал Мечислав Брониславович.*

*— Но в колхозах сейчас нет денег...*

*— В "Красных партизан" сейчас есть деньги.*

*— Я только что звонил в бухгалтерию этого хозяйства, сказали, что денег нет и неизвестно когда будут. А людям ведь жить надо...*

*— Все это тема не для обсуждения с вами.*

*— А с кем тогда?*

*— Я сказал, что — не для обсуждения с вами. Все.*

Короткие гудки в трубке, масса впечатлений и почва для размышлений. Вот она веревочка — от председателя колхоза до председателя райисполкома. А дальше наверх — к бывшему председателю совхоза, ныне президенту — я не пошел. Да и кто бы меня туда пустил, с суконным-то рылом да в калашный ряд? Ну, не хотят с нами обсуждать вопросы большой и малой политики. И вообще, бычку знать не положено, куда его ведут на веревочке.

Ладно, куда ведут — не говорите. Но хоть законно ли все это, вы мне можете сказать?

За соблюдением закона на территории района надзор осуществляет Слонимская межрайпрокуратура. Межрайпрокурор Анатолий Явлаш пообещал разобраться с поднятым вопросом и определить законность решения колхозного руководства.

**Валерий КОВАЛЕНКО**

НАВІНЫ

## ПРЭЗІДЭНТ ВУЧЫЎ ПІСАЦЬ ПАДРУЧНІКІ

**24 красавіка Аляксандр Лукашэнка сустракаўся з прадстаўнікамі аўтарскіх калектываў, якія працуюць над стварэннем новых падручнікаў у гуманітарнагрмадазнаўчай сферы.**

На гэтай сустрэчы пабывалі і настаўнікі гісторыі Дзераўноўскай СШ Вера Фядута і Навадзевяткавіцкай СШ Васіль Ракуць. Падзяліцца сваімі ўражаннямі ад сустрэчы карэспандэнт "ГС" папрасіў аўтара падручнікаў па гісторыі сярэдніх вякоў Беларусі Васіля Ракуця. Васіль Уладзіміравіч, у прыватнасці, сказаў:

— Гэта была рабочая сустрэча прэзідэнта. Мэта яе заключалася ў тым, каб выпрацаваць агульныя падыходы, якія павінны характарызаваць змест падручнікаў гісторыі. Гэта значыць, пачынаючы з цяперашняга часу, выпрацоўваецца новая канцэпцыя гістарычнай адукацыі. У нас была канцэпцыя гістарычнай адукацыі, якая была распрацавана шмат гадоў таму назад пад кіраўніцтвам вучонага, гісторыка Міхася Біча. З таго часу прайшло сем гадоў, адбыліся вялікія змены. Таму ўзнікла неабходнасць выпрацаваць новую канцэпцыю. Распрацаваць яе прэзідэнт прапанаваў магілёўскаму вучонаму Якаву Трашчанку. Гэты гісторык некалі вучыў прэзідэнта. Праўда, афіцыйна канцэпцыю яшчэ не надрукавалі, і сутнасць яе мала вядома.

На сустрэчы было каля 50 чалавек. Яна працягвалася каля трох з паловаю гадзін замест запланаванай адной гадзіны. Выступалі многія з прапановамі і заўвагамі. Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, каб аўтары падручнікаў гісторыі больш пісалі пра Вялікую Айчынную вайну, бо Беларусь, як ён сказаў, — рэспубліка інтэрнацыянальная. На думку Аляксандра Лукашэнкі, грамадазнаўчая літаратура павінна аб'ектыўна адлюстроўваць сацыяльна-палітычныя працэсы ў краіне, а ў падручнікі па літаратуры ўключаць творы, якія нясуць выключна-эстэтычную каштоўнасць.

**Сяргей ЧЫГРЫН**

АФІЦЫЙНА

# З РАШЭННЯЎ СЛОНІМСКАГА РАЙВЫКАНКАМА

**На сваім апошнім пасяджэнні райвыканкам абмеркаваў выкананне раённага бюджэту за першы квартал бягучага года і прыняў рад канкрэтных рашэнняў.**

### Несуцяшальныя факты

У першым квартале гэтага года 49 суб'ектаў гаспадарання з наяўных 103 аказаліся стратнымі. З 23 прамысловых прадпрыемстваў стратныя 11.

Мясцовы бюджэт завінаваціўся абласному фінансаваму ўпраўленню 3,5 млрд. рублёў. Гэтая сума, па словах загадчыцы райфінаддзела Тамары Хворык, раўняецца квартальнай суме даходаў.

### Рэарганізацыя Харашэвіцкай базавай школы

У 2002 – 2003 навучальным годзе школа ў вёсцы Харашэвічы будзе рэарганізавана з базавай (дзевяцігодка) у пачатковую.

Восем вучняў сярэдняга звяна (з чакаемых 15) будуць вучыцца ў Дзераўноўскай СШ і жыць у школьным інтэрнаце.

### Дзіцячы сад №4 будзе зачынены

Такое рашэнне прынята ў сувязі са змяншэннем колькасці дзяцей у гэтым садку.

Дзяцей па ўзгадненні з бацькамі размяркуюць па іншых садках, а ў памяшканні садка №4 з першага ліпеня застануцца працаваць толькі вартаўнікі. З часам памяшканне будзе выкарыстана для іншых мэтаў.

### Месцы для правядзення масавых мерапрыемстваў

Іх пералік адпаведна характару і зместу таксама быў зацверджаны райвыканкамам.

Так, у прыватнасці, месцам для правядзення мітынгаў, пікетаў і іншых палітычных акцый названа вуліца Брэсцкая ля дамоў №№ 71, 73, 75.

### Створаны аргкамітэт

Камітэт па правядзенню святочных мерапрыемстваў з нагоды 750-годдзя Слоніма ўзначаліў старшыня райвыканкама Мечыслаў Касцюк.

Па папярэдніх звестках, мяркуецца, што свята пройдзе ў апошню нядзелю жніўня.

**Падрыхтаваў Мікола КАНАНОВІЧ**

НАВІНЫ

# ПІКЕТ З НАГОДЫ ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ ТРАГЕДЫІ



Фота Віталя ГІЛЯ

**26 красавіка на вуліцы Брэсцкай у Слоніме адбыўся пікет, прымеркаваны да 16 гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС.**

Заяву на правядзенне мерапрыемства ў мясцовы райвыканкам падала Слонімская суполка БНФ. Франтаўцы прасілі ва ўладаў дазволу правесці сваё мерапрыемства ў цэнтры горада, але ў выканкаме вырашылі інакш.

У пікеце прынялі ўдзел дзесяць чалавек. Яны трымалі ў руках плакаты з надпісамі "26 красавіка — дзень нацыянальнага смутку", "Будзем маўчаць — будзем галадаць", "Скажам "не" павелічэнню пенсіённага ўзросту", "Як працуеце, так і атрымліваеце" і іншымі.

Удзельнікі мерапрыемства раздавалі прахожым бюлетэнь "Права на волю" грамадскага аб'яднання "Праваабарончы цэнтр "Вясна" і каляндарыкі радыё "Свабода".

**Мікола КАНАНОВІЧ**

К СВЕДЕНИЮ

## ЗАЙДИТЕ В ПАСПОРТНО-ВИЗОВУЮ СЛУЖБУ.

**Кабинет Министров Украины вынес постановление. Теперь паспорта граждан Украины, оформленные с использованием бланков СССР, действительны только до 1 июля 2002 года.**

В связи с этим, граждане Украины, имеющие такие паспорта и проживающие по видам на жительство, должны срочно прибыть в паспортно-визовую службу Слонимского РОВД. Сделать это необходимо для того, чтобы в последующем не возникло проблем с регистрацией, а также при выдаче и продлении видов на жительство.

**Валерий КОВАЛЕНКО**

## ДЛЯ ТЕХ, КТО БУДЕТ ОТДЫХАТЬ НА УКРАИНЕ

**Украинские власти ввели для иностранных граждан, въезжающих на территорию Украины, новые правила регистрации.**

Об этом сообщил начальник отделения паспортно-визовой службы Гродненского областного управления внутренних дел полковник А. Григорьев. Теперь сотрудники пограничной службы Украины будут выдавать въезжающим на территорию страны иностранным гражданам регистрационные (миграционные) карточки. Одна часть карточки остается у пограничников, другая часть — у въезжающего. Эта часть карточки должна сохраняться на весь период пребывания в стране.

Наличие регистрационной карточки не требует последующего обращения в органы МВД Украины, если срок пребывания в стране не превышает 90 суток.

**Валерий КОВАЛЕНКО**

# ДУШЭЎНАЯ РАЗМОВА

**За тыдзень да Вялікадня ў слонімскім Цэнтры сацыяльнага абслугоўвання сям'і, карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі "Давер" адбылося пасяджэнне клуба "Душа".**

Клуб "Душа" дзейнічае пры Цэнтры з мінулага года. Работнікі "Даверу"запрашаюць на пасяджэнні клуба маці дзяцей-інвалідаў і з мнагадзетных сем'яў, каб разам абмеркаваць і, па магчымасці, вырашыць тыя ці іншыя праблемы. Прававыя кансультацыі, маральная дапамога і матэрыяльная падтрымка — такія накірункі дзейнасці клуба "Душа". Але на гэты раз тэма гутаркі была крыху незвычайнай – Уваскрашэнне Хрыстова, Вялікдзень. На сустрэчу з жанчынамі і іх дзецьмі прыехаў святар з вёскі Навадзевяткавічы Слонімскага раёна айцец Арсеній. На яго і была скіравана ўся ўвага прысутных.

Гутарка не абмежавалася толькі святам Пасхі. Айцец Арсеній пачаў размову з пытання: "Што зараз адбываецца ў свеце, у сям'і, чаму пакутуюць нашы дзеці?..". І на сваё пытанне святар адказаў, што вінаватыя мы самі, бо забываем пра ўласную душу, пра Бога.

Аўдыторыя ўважліва слухала святара і не скупілася на пытанні. Жанчын цікавіла вельмі многае з таго, што звязана з верай у Бога, з царквой. Пытанні, адрасаваныя айцу Арсенію, былі самыя розныя: да якога абраза лепш звяртацца з малітвамі, што значыць паставіць свечку, як па-трэбна хрысціцца і паводзіць сябе ў царкве, ці можа дзіця-ляўша хрысціцца левай рукой і многія іншыя. За шчырай, душэўнай размовай незаўважна праляцелі амаль дзве гадзіны. На ўсе пытанні айцец Арсеній даваў змястоўныя адказы. Расказаў і пра свята Уваскрашэння Хрыстова, а таксама падараваў прысутным брашуру дзіякана Андрэя Кураева "Пасха: шлях з пекла" і апошні нумар газеты "Навагрудскія Епархіяльныя Ведамасці".



*Тым часам, як дарослыя вялі размовы пра духоўнае, дзеці частаваліся прысмакамі з салодкага стала*

> На Слонімшчыне зараз жывуць больш як 200 хворых дзяцей. Хто зразумее і дапаможа дзіцяці-інваліду і яго бацькам? Хто падтрымае хворага на рак? У Слоніме ёсць такая арганізацыя.

Напрыканцы сустрэчы са святаром старшыня таварыства "Дзеці ў бядзе", якое аб'ядноў-вае хворых на рак дзяцей, Надзея Яўсейчык прапанавала арганізаваць малебны для хворых дзетак у памяшканні цэнтра "Давер", дзе б яны пачуваліся больш упэўнена, чым у царкве падчас агульных набажэнстваў. Айцец Арсеній паабяцаў, што са свайго боку паспрыяе рэалізацыі гэтай прапановы, а таксама запрасіў дзетак да прычасця ў Навадзевяткавіцкую царкву, калі па нейкіх прычынах для іх гэта нязручна ў Слоніме.

На развітанне гаспадыні залы падаравалі ўсім паштоўкі-віншаванні ў выглядзе велікодных яек, а таксама паведамілі, што перад Пасхай для шматдзетных і сем'яў з хворымі дзецьмі павінна паступіць гуманітарная дапамога.

**Мікола КАНАНОВІЧ**

НАВІНЫ

## ВИЧ-ИНФЕКЦИЯ НАСТУПАЕТ НА СЛОНИМ

**Серьёзно обострилась эпидобстановка в Слониме, где на 1 апреля этого года выявлен 21 случай ВИЧ-инфекции. 9 случаев из 10, выявленных в Гродненской области за первый квартал 2002 года, приходится на Слоним (90%).**

Об этом говорилось на областном семинаре «Роль и участие немедицинских структур в деятельности по профилактике ВИЧ-инфекции», который прошёл в Гродно.

По состоянию на 1 апреля текущего года в нашей области зарегистрировано 153 случая ВИЧ-инфекции: Вороновский р-н — 1, г.Лида — 102, Лидский р-н — 4, г.Волковыск — 2, г.Гродно — 18, г.Слоним — 21, г.Мосты — 1, г.Новогрудок — 2, Ивьевский р-н — 1, г.Сморгонь — 1.

По половому признаку из общего числа зарегистрированных мужчины составляют 73,2 % (112 человек), женщины — 26,8 % (41 человек).

**Сергей ЧИГРИН**

## ЗЛАЧЫННАСЦЬ НА СЛОНІМШЧЫНЕ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА

**Па лініі крымінальнага вышуку за першы квартал бягучага года, у параўнанні з адпаведным мінулагоднім перыядам, рост злачыннасці на Слонімшчыне павялічыўся на 23,3 %.**

Рэкорд тут усё ж належыць Зэльвеншчыне, дзе рост злачыннасці павялічыўся на ўсе 100 %. А вось на Дзятлаўшчыне і Мастоўшчыне злачынстваў стала менш на 30,6 % і на 53 %.

**Сяргей ЧЫГРЫН**

ПЕДАГОГІКА

# СПАБОРНІЧАЛІ "ІЛЬВЫ" І "КРАКАДЗІЛЫ"



*У спаборніцтве па перацягванню каната сілы аказаліся роўнымі*

**На мінулым тыдні дзеці і выхавацелі чатырнаццатага садзіка прымалі гасцей з дзетсада №17, каб паспаборнічаць з імі на спрыт і кемлівасць.**

Перад пачаткам імправізаванай спартакіяды паміж камандамі двух садзікаў вакальная група гаспадароў "Крынічка" выканала беларускія песні-прыпеўкі "Чаму ж мне не пець...". Увогуле, сцэнарый казачнага плавання на караблі праз мора да джунгляў "Ільвоў" (каманда дзетсада №14) і "Кракадзілаў" (каманда дзетсада №17) уключаў у сябе не толькі серыю гульнявых нумароў, але і выступленні маленькіх танцораў і артыстаў. Гэта крыху ахалоджвала эмоцыі ўдзельнікаў спаборніцтваў і гледачоў. А эмоцыі гэтыя можна было параўнаць хіба што з рэакцыяй трыбунаў падчас хакейнага алімпійскага матчу "Беларусь" — "Швецыя".

І хоць перамогу ў спартакіядзе здабылі "Ільвы", якім дома і родныя сцены дапамагалі, але ўзнагароды — шакаладныя медалі — атрымалі дзеці абедзвюх камандаў.

Добра, што ў слонімскіх дашкольных дзіцячых установах ёсць людзі, здольныя накіраваць няўрымслівую энергію сваіх выхаванцаў ім на карысць. Бо дзеці, навучаныя пераадольваць перашкоды і перамагаць (альбо прайграваць) у гульнях, тым самым засвойваюць першыя жыццёвыя ўрокі.

**Мікола КАНАНОВІЧ**

ПОЧТА

## ПРЕДОСТАВЛЯЮТ ВСЕ ВОЗМОЖНОСТИ

Кажется, совсем недавно наши дети шли на школьную линейку, посвящённую началу учебного года, и вот уже близится последний звонок.

Мальчишки и девчонки перейдут в следующий класс, а выпускники навсегда покинут школу. На смену им придут первоклашки. Каждый маленький человек — это чистый лист бумаги. Каким он станет к окончанию школы, зависит от того, кто, что и как будет писать на этом листе.

Очень важно, чтобы на пути маленьких человечков встретились добрые, умные, знающие учителя. Чтобы школа предоставила все возможности для развития тех качеств, которые таятся в каждом ученике.

В слонимской СШ №3 дети имеют возможность более глубоко изучать те предметы, которые им больше всего нравятся. Там развивают способности к рисованию, танцам, пению, иностранным языкам и другие. По мере того, как ученики переходят из класса в класс, у них появляется интерес к отдельным предметам. Например, к химии, биологии, физике, информатике. И школа создаёт условия для их более глубокого изучения в лицейских и предлицейских классах. Чтобы помочь старшеклассникам в подготовке к поступлению, учителя строят свои занятия таким образом, чтобы дать максимальное количество знаний, необходимое для поступления в ВУЗы.

Хочу обратиться к родителям будущих первоклашек. Если вы хотите, чтобы ваши дети ходили в школу с удовольствием и получали всестороннее образование — приводите своих деток в СШ №3. Не пожалеете!

**Светлана КОРПИК, мать учеников 2-го и 9-го классов СШ №3**

СВЯТА

# МУЗЫЧНАЙ ШКОЛЕ – 45



*Трыо акардыяністак: Наталля Троцкая, Вольга Якута, Таццяна Міско*

**Слонімская дзіцячая музычная школа адзначае ў бягучым годзе свой 45-гадовы юбілей. Выступаючы на мінулым тыдні з уступным словам перад пачаткам штогадовага справаздачнага канцэрта, дырэктар школы Наталля Мазец звярнулася да гісторыі.**

У 1956/57 навучальным годзе 26 дзяцей сталі першымі вучнямі школы па спецыяльнасцях фартэпіяна і баян. Сёння навучанне вядзецца па 13 музычных спецыяльнасцях, у школе дзейнічаюць хор "Камерата", духавы аркестр, камерны ансамбль, аркестр народных інструментаў і іншыя творчыя калектывы. За 45 гадоў педагогі школы далі пуцёўку ў жыццё не аднаму пакаленню музыкантаў.

Канцэрт пад назвай "Дарыце музыку адзін аднаму " сабраў 25 красавіка амаль поўную вялікую



*На сцэне — духавы аркестр*

залу РДК. Юныя артысты і іх настаўнікі паказалі гледачам сапраўднае майстэрства ў валоданні музычнымі інструментамі і вакалам. Амаль паўтары гадзіны вядучая аб'яўляла ўсё новыя і новыя нумары і на розныя лады гучала музыка.

**Мікола КАНАНОВІЧ**

ВОЛКОВЫСК

## ГРАНАТА У ПЕРРОНА

**Средь бела дня на пустыре у привокзальной площади в Волковыске, недалеко от перрона железнодорожного вокзала дворники обнаружили гранату Ф-1.**

Прибывшие на место происшествия сапёры установили, что опасная находка прекрасно сохранилась со времён Великой Отечественной войны и вполне могла взорваться.

**"МВ"**

ДЯТЛОВО

## НЕБЛАГОДАРНЫЙ ПОПУТЧИК

**Творить добро у нас становится всё накладней. И речь идёт уже даже не о символическом вознаграждении за праведный поступок. При своих бы остаться...**

В данном случае не повезло 33-летнему лидчанину, который по доброте душевной, следуя на автомашине "Опель-Кадет" в сторону Дятлово, решил подбросить в попутном направлении "голосующего" мужчину.

Попутчик сел в машину возле посёлка Дитва Лидского района и всю дорогу казался очень милым. После того, как пассажир покинул транспортное средство вблизи д.Погири Дятловского района, водитель обнаружил пропажу барсетки, а вместе с ней и 51 доллара США, 10 тысяч рублей, водительского удостоверения и техпаспорта на машину.

По описаным пострадавшим приметам, сотрудники Дятловского РОВД сразу же узнали ранее судимого жителя д.Погири, которому, вероятно, скоро придётся вновь осваивать в местах не столь отдалённых правила хорошего тона.

**"МВ"**

РЭГІЁН

## КОЖНЫ ЧАЦВЕРТЫ ЎЧАСТКОВЫ НЕ МАЕ ЎЛАСНАГА ЖЫЛЛЯ

**Як паведаміў на чарговым пасяджэнні аблвыканкама начальнік упраўлення ўнутраных спраў А. Белашэўскі, у Гродзенскай вобласці налічваецца 395 участковых інспектараў міліцыі — афіцэраў і 73 малодшых участковых інспектараў у званні прапаршчыкаў і сяржантаў.**

Сто восемдзесят два з іх маюць юрыдычную адукацыю. Але ж, больш за трэць інспектараў (133) дагэтуль не маюць жылля. І гэта пры тым, што па Закону "Аб міліцыі" жыллё павінна выдзяляцца ўчастковым інспектарам не пазней за 6 месяцаў з моманта ўступлення ў пасаду.

Акрамя гэтага, 73 вясковых інспектары не забяспечаны службовым транспартам, а дваццаць — не маюць службовых кабінетаў.

**Валерый КАВАЛЕНКА**

## ПАД НАГЛЯДАМ МІЛІЦЫІ — 21 ТЫСЯЧА ЧАЛАВЕК

**На ўліку ў тэрытарыяльных органах унутраных спраў Гродзенскай вобласці знаходзяцца больш за 21 тысячу чалавек.**

З гэтай колькасці людзей, што знаходзяцца пад наглядам міліцыі, толькі 3 917 раней былі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці і маюць знятую судзімасць. Па дадзеных абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў тысяча семсот дваццаць пяць сістэматычна парушаюць закон, а 8 163 — схільны ці злоўжываюць спіртнымі напоямі.

**Валерый КАВАЛЕНКА**

# БЕЗ ВІНЫ ВІНАВАТАЯ

ТРАГЕДЫЯ

**Штосьці чужое і незвычайнае ў паводзінах маці першай заўважыла старэйшая дачка. У дзіцячае аддзяленне Зэльвенскай раённай бальніцы Таня паступіла ў канцы студзеня. Хутка туды ж паклалі і Таніну маці Тамару з малодшай дачкой. Двухгадовай Наташы ўрачы паставілі дыягназ хваробы.**


Малюнак Яўгена ІВАНОВА

Маці і малодшая сястрычка знаходзіліся ў іншай палаце. Але думка пра тое, што родныя побач сагравала Таніна сэрца.

Аднойчы, зайшоўшы да маці і Наташы, дзяўчынка застала маму ў незвычайнай разгубленасці. Заўсёды ўважлівая да дзяцей, Тамара чужым імем назвала дачку, не магла ўспомніць, які тады быў дзень, скардзілася на галаўны боль. Яна прызналася Тані, што ў бальніцы ёй не падабаецца і яна хоча ўцячы.

Ніхто з суседак па палаце нічога падазронага ў паводзінах Тамары не заўважаў. Можа таму, што яшчэ з самага прыезду ў бальніцу Тамара была маўклівай і крыху дзіўнаватай. Да таго ж, у кожнай з жанчын была свая праблема — уласнае хворае дзіця.

Дзіўныя паводзіны маці хвалявалі старэйшую дачку, і яна прапанавала ёй схадзіць да ўрача-неўрапатолага. Але Тамара адмовілася.

Шостага лютага наведаць пляменніц у бальніцу прыйшла Тамарына сястра Наталля. Ёй падалося, што сястра выглядае стомленай і чымсьці прыгнечанай. У гэты ж дзень вячэраць у сталоўку дзіцячага аддзялення Тамара і Наташа не з'явіліся. А каля 19 гадзін жанчына з малодшай дачкой пакінулі аддзяленне. Тады на гэта ніхто не звярнуў увагі. Але праз некаторы час медсястра паведаміла дзяжурнаму ўрачу бальніцы пра знікненне хворай дзяўчынкі і яе маці...

Сёмага лютага ў 4 гадзіны раніцы ў дзверы кватэры жыхара Зэльвы Ц. нехта пазваніў. На парозе стаяла незнаёмая жанчына ў брудным адзенні. Яна плакала і прасіла ёй дапамагчы. Незнаёмка сцвярджала, што хтосьці хацеў утапіць яе ў дрыгве, і яна некалькі гадзін праляжала ў вадзе. Сваё імя яна не памятала. Але з блытаных словаў жанчыны гаспадар кватэры змог давесціся, што яе хворае дзіця знаходзіцца ў бальніцы, а муж нідзе не працуе. Яна скардзілася на свой нешчаслівы лёс і казала, што не хоча жыць. Нечакана, быццам прыйшоўшы ў сябе, жанчына пачала распытваць ў гаспадара, дзе знаходзіцца вёска Конна. Даведаўшыся, як туды дабрацца, яна пакінула свой часовы прытулак.

Таню з бальніцы забрала бабуля. Яна ж звярнулася ў міліцыю з заявай пра знікненне дачкі і малодшай унучкі. А ўрачы дзіцячага аддзялення тэрмінова "выпісалі" Тамару і Наташу з бальніцы.

Вечарам таго ж дня Тамара прыйшла ў Зэльвенскі РАУС і пачала расказваць супрацоўнікам міліцыі, як яна з дачкой пакінулі бальніцу і пайшлі ў невядомым накірунку, як патрапілі ў балота. А вось дзе і калі яна згубіла дзяўчынку, жанчына ўспомніць не магла. Адзінае, што адбілася ў яе памяці, гэта нейкая цемра, у якую яны з малой патрапілі...

Цела маленькай Наташы знайшлі недалёка ад будынку бальніцы ў сцёкавай канаве без прыкмет гвалтоўнай смерці. Медыцынскі эксперт устанавіў, што смерць дзяўчынкі наступіла ад пераахалоджання арганізма.

У Тамары пры абследаванні ў Слонімскім неўралагічным аддзяленні былі выяўлены прыкметы псіхічнага захворвання, і жанчыну накіравалі на лячэнне.

**Наталля ГЛУШЭНЯ**

# ЦЫГАНКИ-ВОРОВКИ

ИЗ ЗАЛА СУДА

**"Цыганы шумною толпою по Бессарабии кочуют"... Многим знакомы эти строки из пролога поэмы А.С.Пушкина "Цыганы". Известен и печальный эпилог этого произведения.**


Фота IREX/ProMedia

Судьба цыганки Земфиры из этой поэмы вызывает сочувствие, чего нельзя сказать о судьбе её соплеменниц Виктории Томашевич и Любы Купченко. Они кочевали не по Бессарабии, а тихо передвигались по деревням и городам Слонимщины и Зельвенщины.

Так, 15 октября 2001 года Купченко и Томашевич, воспользовавшись ключом, который лежал под дверью дома в деревне Особняки Слонимского района, проникли в жилище, откуда похитили 125 тысяч рублей.

Они же, спустя несколько дней, аналогичным способом обворовали дом в г. Слониме, откуда украли 140 тысяч рублей.

В ноябре 2001 года эти женщины через закрытую дверь проникли в дом в деревне Забулье Зельвенского района, где похитили у хозяев 150 тысяч рублей.

У французов есть пословица: аппетит приходит во время еды. Люба и Виктория придерживались этой пословицы, но только на свой манер. Крали с нарастающими суммами. В деревне Гловсевичи, что на Слонимщине, через незапертую дверь они проникли в дом и украли у потерпевших 220 тысяч рублей. Таким же образом воровки "наказали" за доверчивость хозяев дома и в деревне Заверше Слонимского района, обокрав их на сумму 1 540 долларов США.

На вопрос суда, куда тратились деньги, Томашевич ответила — приодели детей. Кстати, Виктория — сама ещё ребёнок. Этой маме двоих несовершеннолетних детей ещё самой не исполнилось восемнадцать лет. Воровала же она совместно с Купченко как заправские воры. Осуждённые хорошо изучили психологию пожилых людей. Когда старики копались в огороде, те "копались" в их домах.

В деревне Деречин, что на Зельвенщине, проживают два престарелых человека. Осенью большую часть дня потерпевшие проводили на "сотках", положив ключи под коврик у входных дверей, да так, что их легко было обнаружить. Вернувшись домой, пенсионеры не нашли своей пенсии, потому что её украла цыганка Томашевич. Потерпевшие долго подозревали друг друга в том, что супруг (супруга) истратили эти деньги на свои нужды, но их обиду развеял через три месяца участковый милиционер, сообщив им, что их обидела цыганка.

Пушкин свою поэму заканчивает словами: "старик-отец один сидел и на погибшую глядел". Нет, Томашевич и Купченко живы и здоровы, только сидят они сейчас в тюрьме и выйдут на свободу через пять лет.

**Александр ЗАХАРОВ, пом. прокурора Зельвенского района, юрист I класса**

МАСТЫ

## БЫЦЬ ГІМНАЗІІ

**У СШ №1 прайшла сустрэча бацькоў вучняў гэтай школы з удзелам кіраўніцтва аддзела раённай адукацыі, дырэктара школы і яго намеснікаў. Абмяркоўвалі актуальнае пытанне — стварэнне гімназіі на базе гэтай школы.**

На сустрэчу запрашаліся бацькі з іншых школаў, але яны не прыйшлі. Загадчык аддела адукацыі райвыканкама Ярмак і дырэктар школы Лукічова распавядалі пра паэтапны пераход цяперашняй школы да гімназіі. Першымі гімназістамі стануць вучні першага класа.

У гэтай школе ёсць мяккая мэбля, пра якую іншыя школы нават не мараць, бо не маюць грошай, каб набыць нават крэйду.

Тым не менш, з вучняў, якія не патрапяць сёлета ў гімназію, а дакладней з іх бацькоў, на рамонт школы дырэктар Лукічова запатрабавала па некалькі тысяч рублёў.

**Язэп ПАЛУБЯТКА**

## БЕСПРАЦОЎЕ КАТАСТРАФІЧНА ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА

**Яшчэ месяц назад у Мастоўскім цэнтры занятасці афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных было 480 чалавек. На 21 красавіка іх налічвалася 608.**

Да ліку беспрацоўных не адносяцца асобы, якія зволіліся па ўласнаму жаданню.

Такіх людзей, згодна нашаму заканадаўству, на ўлік па беспрацоўю не ставяць. Яны альбо займаюцца дробным бізнесам, альбо "шабашаць" у новых беларусаў.

Па ацэнках незалежных экспертаў, такога кшталту беспрацоўных на Мастоўшчыне зараз налічваецца не менш двух тысяч. У большасці сваёй, гэта маладыя людзі.

**Язэп ПАЛУБЯТКА**

## ПРЫМУШАЮЦЬ СЛУХАЦЬ



**Напрыканцы красавіка ў Мастах адбудзецца канцэрт беларускай спявачкі Ірыны Дарафеевай.**

Яшчэ не былі развешаны афішы, а райвыканкам ужо абавязаў супрацоўнікаў раённага аддзела культуры, а таксама кіраўнікоў іншых арганізацый накіраваць людзей на канцэрт дзеля стварэння масавасці.

Напрыклад, супрацоўнікі аддзела культуры павінны былі заплаціць болей за паўтары тысячы рублёў за гэты канцэрт, незалежна ад таго, будуць яны прысутнічаць на ім ці не. Афіцыйны кошт квітка — ад трох да чатырох з паловаю тысяч рублёў.

**Язэп ПАЛУБЯТКА**

## ЗМЕНА ДЫРЭКТАРСКІХ КРЭСЛАЎ

**Дырэктар аўтабазы № 9 Сямён Заноза ўзначаліў прадпрыемства матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння.**

На яго пасаду прызначаны былы галоўны інжынер аўтабазы Пётр Непарка. Апошняму дасталася цяжкая спадчына. Грузавыя перавозкі зведзены да мінімуму. Знята шмат аўтобусных маршрутаў. Бываюць дні, што аўтобусы не выходзяць на лінію па прычыне адсутнасці сродкаў на набыццё паліва.

**Антон МАКЕЙ**

Газета Слонімская
2 — 8 траўня 2002г. №18 (256)

# АПРЕЛЬСКИЕ ТЕЗИСЫ,

## или к ужесточению через ожесточение

**СОБЫТИЕ**

**23 апреля выбило Беларусь из привычного, размеренного темпа жизни. Нарушителем спокойствия стал президент, выступивший с Посланием к парламенту, а заодно и к народу Беларуси.**





*Александр Лукашенко (фото с официального сайта администрации президента)*

Ничего не скажешь, речь Александра Григорьевича оказалась содержательной и, как всегда, сверхэмоциональной. А вот чего не хватало, так это последовательности в Послании самом по себе. Да и верность политике последних семи лет пошатнулась. О бесцеремонности Лукашенко уже и говорить не приходится. Впрочем, чтобы не быть голословными, будем приводить цитаты, – они сами лучше всего расскажут об их авторе и о нашей жизни, прошлой и будущей.

Прежде всего, сравнил Лукашенко свое Послание с аналогичными обращениями американского и российского президентов. И если речь Буша-младшего *"отражает состояние мобилизованности американского общества перед лицом ... террористического акта 11 сентября 2001 года"*, то *"Россия" в бореньях" определяет стратегию своего развития"*. Россия, оказывается, *"на распутье"* и не знает, к кому прислониться. То ли к Западу, потрясаемому кризисами и *"страшным хаосом"*, то ли к Беларуси, *"имеющей ясную, четкую программу развития"*.

В конце концов, *"Россия признала (Владимир Владимирович это мне прямо сказал), что Беларусь является наиприоритетнейшим направлением действий Российской Федерации"*.

Затем президент остановился на итогах года прошедшего, рассказал о том, как он сорвал *"планы влиятельных сил за рубежом и их доморощенных прихлебателей"*. В результате, *"год президентских выборов не стал годом конфликтов и дестабилизации нашего общества"*. Зато этот год *"войдет в историю наших городов и сел введенными в строй школами, больницами, дорогами"*. Видимо, это был последний год, когда их строили, поскольку читаем дальше: *"Нам больше не надо школ и больниц, мы привести должны в порядок то, что есть, особенно школы, потому что наметился демографический спад"*. Железная логика, – нечего возразить.

Столь же последователен А. Лукашенко и в том, что *"люди должны понимать, что надо потихонечку двигаться от надежд только на обеспечение со стороны государства на зарабатывание этих денег. Деньги лежат на поверхности, их только надо взять"*. И далее, *"я к чему это говорю. Я говорю это к тому, что некоторые кричат: ах, после выборов президентских стало хуже. Нет, не хуже стало. Просто политика потихонечку начинает ужесточаться, людям предлагается заработать деньги самим"*. И это после стольких лет приучения к гарантированной – нищенской, правда, – зарплате. Что дальше? *"Пусть зарабатывают. Тем, кто не может, мы поможем. Тех, кто не хочет, попробуем заставить. Ну, а кто не может, не хочет и вообще бежит от труда, ну, что ж..."*

Наконец-то, на самом высоком уровне признана необходимость рыночных реформ. *"Свободных ресурсов у государства нет, и мы активнее должны подключать рыночные механизмы."* Но *"развитие белорусской экономики не может сводиться только к стимулированию малого и среднего бизнеса"*. Потому что понимание этого самого малого бизнеса у президента вылилось в вопросе: *"И захотят ли все стать "челноками" и торговать на рынке?"*. Конечно же, не все этого захотят. Не потому ли такая трогательная забота у Лукашенко о действующих депутатах: *"... эти люди через 1,5-2 года захотят остаться кто в Минске, кто пойти просто на государственную службу, на работу в государственные органы. Их надо к этому готовить, всех желающих депутатов"*. Неизвестно, правда, где на всех желающих чиновничьи должности найти, ведь *"численность чиновников всех уровней сокращена ... на 10 процентов, или на три тысячи человек"*, а *"административно-бюрократический "жирок" еще снимать и снимать"*.

Кстати, о жирке настоящем в сфере медицины. *"Я ... на примере республиканской больницы провожу и провел своего рода эксперимент. ... Как только я провел перераспределение по ... больнице – миллионы звонков и просьб. Ну, "все государство побежало": прикрепите, прикрепите... Это ведь ведомственная больница. ... Это больница для государственных служащих, и я принял радикальное решение. Там должны лечиться не только мы, начальники, – Президент, члены правительства, депутаты, но и простые государственные служащие, которые работают на депутатов и Президента не меньше, чем мы сами. А почему они не могут со своими детьми быть прикреплены к этой больнице? Я прикрепил где-то, по-моему, 16-17 тысяч. И пошло-поехало. ... А дальше – больше. ... Управляющая делами Президента Журавкова Г.А. там создала, простите меня за это слово, откормочную базу. Пять тысяч калорий в день! ... Тогда как в стране чуть больше двух тысяч, по-моему."* Это уж вы как хотите понимайте, но стилисты у Александра Григорьевича никудышные. А когда президент страны за более чем семь лет правления не научился следить за своей речью, что можно сказать о его способностях руководителя?

Да он просто в революцию играет. Все у него враги и оппозиционеры, корпящие над развалом страны. И лишь президент созидателем себя зарекомендовал. А строиться-то все штурмовщиной и неизвестно из каких средств. Вот Национальная библиотека... *"В нынешнем году мы обязательно должны начать хотя бы "копать землю" на месте строительства этого объекта. Если хотите, именем революции, но должны."* А *"на те сооружения, которые сегодня строятся, мы из бюджета берем каплю. Вы ... там хоть в одной строке нашли деньги на это строительство? Нет." "Мерседесы", за которые сейчас критикуют, за бесценок удалось купить. ... Нет, шум поднялся... Ну, я что, из бюджета эти деньги взял? Да ни копейки из бюджета не взял. Где взял – это мое дело. Я законно их взял."*

Ну откуда же это бесцеремонное противопоставление себя всем остальным и понимание себя над Законом, как истины в последней инстанции? Почему возможно открытое декларирование своих противоправных действий в будущем: *"...никогда (это неправильное, может, заявление Президента, но я его сделаю) больше не буду поддерживать предпринимателей при выборах в парламент. Я буду этому препятствовать"*.

Что ж, умеючи да с накопленным опытом, все это возможно, ведь цель оправдывает средства. *"...стране, народу нужен результат."* Да вот только, Александр Григорьевич, *"у каждого сделанного или проваленного дела есть свой автор, которого люди должны знать в лицо"*.

Лицо белорусского президента знакомо всей стране. Но пока скрывают от народа, умело манипулируя сознанием, автором хорошего или плохого дела он является.

**Валерий КОВАЛЕНКО**

# "ЧАРНОБЫЛЬСКІ ШЛЯХ" В МИНСКЕ ЗАВЕРШИЛСЯ БЕЗ ПРОИСШЕСТВИЙ

**Проходившая 26 апреля в Минске традиционная акция оппозиции "Чарнобыльскі шлях" завершилась молебном на пересечении улиц Сурганова и Куйбышева.**




*Минск. 26 апреля 2002 года*

Четырехтысячная колонна под бело-красно-белыми флагами и многочисленными транспарантами на чернобыльскую тематику в 19.10 остановилась, не доходя примерно полкилометра до площади Бангалор.

Священник незарегистрированной Белорусской православной автокефальной церкви отец Леонид совершил молебен о жертвах чернобыльской трагедии.

В его молитве прозвучала просьба о даровании всем жителям страны безмерной любви к своей Родине, потому что только такая любовь может преодолеть чернобыльскую беду.

После молебна была объявлена минута молчания, склонены в знак траура флаги и зажжены свечи, которые многие участники демонстрации несли в руках.

Акция завершилась мирно, без задержаний и столкновений.

